


РЭЛІГІЙНЫ КАЛЯНДАР НА 2020 ГОД 4—5



ІВАН АХЛАБЫСЦІН ПРА ТВОРЧАСЦЬ І ЖЫЦЦЁ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 СТУДЗЕНЯ 2020 г. СЕРАДА № 3 (29117)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый БОНДАР, міністр культуры:**

*«Работнікі культуры традыцыйна не лічыліся высокааплатнай катэгорыяй, але мы здолелі ў 2019 годзе нарасціць заработную плату. У сярэднім яна склала 640 рублёў па галіне. Урад распрацаваў план па павышэнні заработнай платы да 2023 года да ўзроўню 80 % ад вытворчай сферы. Такія задачы нам пастаўлены».*

# НАША СІЛА — У АДЗІНСТВЕ

## На Раства ў храме Прэзідэнт гаварыў аб самым важным

**Па традыцыі калядную раніцу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустракае разам з праваслаўнымі вернікамі аднаго з мінскіх прыходаў. У 2018 годзе кіраўнік краіны запаліў святочную свечку каля цудатворнай Мінскай іконы Божай Маці, ахоўніцы сталіцы. Летась Прэзідэнт наведаў прыход велічнага Храма-помніка ў гонар Усіх Святых. А сёлета кіраўнік краіны павіншаваў вернікаў з Нараджэннем Збавіцеля ў храме ў гонар іконы Божай Маці «Дзяржаўная» Свята-Елісавецінскага жаночага манастыра горада Мінска ў мікрараёне Навінкі. Абіцель уключае ў сябе комплекс з некалькіх храмаў у сталіцы і яе ваколіцах, нядзельнай школы, дома паломнікаў, майстэрняў, манастырскіх крам. Ужо некалькі гадоў манастыр займаецца ўзвядзеннем уласнага духоўна-асветніцкага цэнтра, будаўніцтва якога рэалізавана цяпер на 60 працэнтаў.**

«Яшчэ раз хачу павіншаваць вас з Новым годам і адным з галоўных нашых свят — Раством Хрыстовым. Светлае, добрае свята, якое ўсяляе ў нашы сэрцы веру, надзею, любоў і дабрыню. Мне здаецца, гэты манастыр, гэты храм і абіцель, у якой мы знаходзімся, і ёсць увасабленне гэтых добрых і светлых слоў», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да прысутных прыхаджан.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## КОРАТКА

• На конкурс «100 ідэй для Беларусі» ў 2019 годзе пададзена больш за 1 тысячу заявак. У фінале, які, як чакаецца, пройдзе ў лютым, возьмуць удзел 100 найлепшых праектаў.

• **У Лідскім раёне адрадзілі традыцыю абраду «Тры каралі».**



• Больш за ўсё шматдзетных сем'яў жыве ў Брэсцкай вобласці.

• **У Беларусі павысяць хуткасны рэжым на 19 участках рэспубліканскіх аўтадарог і МКАД.**

• Навагодняя ёлка згарэла на плошчы ў Гомелі.

• **Кніжная спадчына Уладзіслава Сыракомлі вернецца ў Беларусь.**

• Пад Смалявічамі ратавальнікі дапамаглі ласю выбрацца з палонкі.

• **Гэтай зімой у Беларусі можна назіраць з дапамогай анлайн-трансляцыі за кармушкай для птушак. Яна размешчана на ўскраіне Белавежскай пушчы. З пачатку снежня трансляцыю глядзела больш за 2 тысячы чалавек з 30 краін, з усіх кантынентаў, акрамя Паўднёвай Амерыкі.**

# ГУЛЬНЯ ЯК СВЯТА

**Міжнародны Калядны турнір аматараў хакея нездарма называюць неафіцыйным чэмпіянатам свету. За той час, што ён праводзіцца, — а сёлета гэта быў ужо шаснаццаты раз — спартыўны форум набыў аўтарытэт сярод вядомых хакеістаў з многіх краін. З кожным годам на яго з'язджаюцца ўсё новыя каманды — як з «нехакейных» краін, напрыклад Кітая і Арабскіх Эміратаў, так і з тых, для якіх гэты від спорту адзін з асноўных, — да заўсёднікаў турніру зборных Расіі і Фінляндыі сёлета далучылася каманда ЗША.**

У чым сакрэт нязменнай папулярнасці гэтых спаборніцтваў у хакеістаў, якія з прафесіяналаў перайшлі ў аматары? Адказ на гэта пытанне даў Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка — ініцыятар і пастаянны непасрэдны ўдзельнік турніру — падчас сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея (IIHF) Рэнэ Фазелем (прысутнасць спартыўнага функцыянера такога рангу на адкрыцці турніру таксама сведчыць аб статуснасці спаборніцтва). «Для спартсменаў гэта проста свята, калі яны сустракаюцца на лёдзе праз дзясяткі гадоў пасля таго, як пайшлі з прафесійнага спорту», — сказаў беларускі лідар, заўважыўшы, што хакеісты заканчваюць кар'еру ўжо ў 30—35 гадоў і толькі некаторыя гуляюць даўжэй. За гады, прысвечаныя спорту, яны прывыклі да апладысментаў і запоўненых арэн. Вярнуць і хакеістам, і балельшчыкам, якія любяць гульнявыя віды спорту, адчуванне свята — галоўная мэта задуманага калісь Каляднага турніра. І задуму ажыццявілі на ўсе сто. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што гэтыя спаборніцтвы ў Беларусі працягнуць падтрымліваць, магчыма, павялічваючы лік камандаў-удзельніц: «Ахвотных прыехаць — велізарная колькасць. Але мы пакуль з розных прычын абмяжоўваемся 12 камандамі. Хацелася б, каб іх было больш».




Фота БелТА.

СТАР. 2

Наш фармат

# Стаць часткай нябёсаў для іншага

**Без Гран-пры, затое з падарункамі ўсім удзельнікам і насамрэч святочным, светлым, добрым і сентыментальным настроем. Днямі ў Мінску па благаславенні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, прайшоў 6-ы калядны фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы». Самадзейныя і аматарскія тэатральныя калектывы з розных рэгіёнаў Беларусі дарылі сваё добрае мастацтва дарослым і маленькім гледачам. Што адметна, трапіць на батлеечныя і лялечныя спектаклі кожны ахвотны мог цалкам бясплатна — трэба было толькі прыйсці загадзя ў сталічны Палац мастацтваў і атрымаць запрашальнік у адміністрацыі.**

За два дні гледачы ўбачылі дзевяць пастановак у конкурснай праграме і яшчэ чатыры дадатковa па-за конкурсам. А напрыканцы фэсту па традыцыі адбылося ўшанаванне лаўрэатаў. Дарэчы, сёлета ў іх лік трапілі практычна ўсе тэатры, бо арганізатары «Нябёсаў» вырашылі не прысуджаць галоўны прыз, а адзначыць найлепшыя якасці кожнага калектыву.

СТАР. 3




Фота арганізатараў фестывалю.

ISSN 1990 - 763X
20003

# НАША СІЛА — У АДЗІНСТВЕ

## ГОДНА ПЕРААДОЛЕЦЬ ЦЯЖКАСЦІ

Прэзідэнт яшчэ раз звярнуўся да тэм, якія гучалі ў яго навагоднім прамове, і падкрэсліў, што мінулы год быў няпросты для краіны, а асабліва выклікае насцярожанасць — як звычайна — эканоміка. «У навагоднім звароце я ўжо казаў, што сяляне з гонарам пераадолелі гэты складаны год, таму што да 2019 года мы перажылі як мінімум два складаныя для сельскай гаспадаркі гады. Гэта былі засушлівыя гады, якія радасці сялянам не прынеслі. І я шмат казаў пра тое, што мы практычна зрасходавалі ўсе рэзервы па прадуктах харчавання і іншых кірунках», — нагадаў лідар краіны.

Свае прагнозы (як мінімум рэцэсію, застой у сусветнай эканоміцы ) даў Прэзідэнт і на гэты год. Ён дадаў: «Год будзе вельмі няпросты. Нам трэба шмат зрабіць, для таго каб, як і раней, годна прайсці яго, захаваўшы нашу краіну, захаваўшы сваю незалежнасць, захаваўшы, што называецца, правa людзьмі звацца».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## МІР — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Але самае галоўнае дасягненне краіны ў мінулым годзе — захаваны мір і спакой на нашай зямлі. Мір міжнацыянальны і міжканфесійны — тое, чым ганарыцца наша Беларусь.

«Успомніце, няпростыя былі часы, знаходзіліся мы і ў блакадзе, і ў ізаляцыі, і санкцыі ўводзілі супраць нас. І нам было няпроста. І толькі дзякуючы нашаму адзінству мы выстаялі. І ў гэтым адзінстве — залог усіх нашых поспехаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

І значную ролю ў захаванні гэтага адзінства сыграла, на яго думку, менавіта царква — усе канфесіі нашай краіны. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў праваслаўным святарам за мір і спакой у краіне, бо яны зрабілі значны ўнёсак у дасягненне гэтага.

«Усюды няпроста, хто б як ні ўзносіў свае поспехі і заслугі, і іншае: я аб'ехаў увесь свет, паверце — усюды няпроста. Гінуць людзі, гінуць дзеці. У нас таксама гэтага хапае, але толькі па нашай нядбаласці, а не таму, што намі кіруюць звонку», — сказаў беларускі лідар.

## З НАДЗЕЯЙ НА СВЕТЛУЮ БУДУЧЫНЮ

Кіраўнік краіны падзякаваў насельнікам манастыра за тую дабрачынную работу, якую яны праводзяць на карысць хворых, абяздоленых, тых, хто мае патрэбу. «На гэтае месца я абавязкова прыеду і пагляджу, што тут магчыма зрабіць. Бо гэта тое, што мне асабліва падабаецца ў царкве, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі прыходзяць у храм, манастыр людзі па сваёй волі, як матушка сказала: ад свайго сэрца Гасподзь пазваў, яны прыйшлі, і робяць добрыя справы».

«У гэты светлы дзень у нас асаблівая радасць. Яна асаблівая, таму што прадстаўнік нашага народа, наш Прэзідэнт, наведвае наш храм, нашу абіцель і гаворыць вельмі важныя словы — не фармальна, а ад сэрца. Дзякуй вам. Тут дваццаць гадоў таму нічога не было, была пустка. Не было багатых спонсараў, ніводнага. Але былі людзі, якія хацелі дапамагаць тым, хто трапіў у бяду. А іх шмат. Тут вакол бальніцы — і людзям неабходна радасць, прыгажосць, таму і створаны гэты храм, манастыр, — звярнуўся да Прэзідэнта настаяцель храма ў гонар іконы Божай Маці «Дзяржаўная» — протаіерэй Андрэй Лемяшонак. — Нам вельмі важна, што вам тут спадабалася, што звярнулі на нас увагу. Гэта вельмі прыгожа. Мы разумеем, як складана вам сёння весці нас наперад, даваць нам надзею на светлую будучыню. А яна ў нас ёсць і будзе. Таму хацелася б вам пажадаць шмат сіл, здароўя. Бо неабходна шмат працаваць. І перажыванні за ўсё, за ўвесь народ у вашым сэрцы».

У дар царкве Аляксандр Лукашэнка перадаў ікону «Раство Хрыстова» беларускага аўтара Андрэя Шчарбініна. Настаяцель храма — ікону святой Ефрасінні Полацкай, выраблену ў майстэрні манастыра.

Праводзілі Прэзідэнта прысутныя ў храме і насельнікі абіцелі, як прынята ў праваслаўных — гучным, сумесным спевам песні «Многая лета».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ГУЛЬНЯ ЯК СВЯТА

## Хакей, які аб'ядноўвае людзей

Самі хакеісты, якія прыязджаюць на турнір, з задавальненнем дзеляцца прыемнымі ўражаннямі. «Канкурэнцыя на Калядным турніры — далёка не галоўнае. Гэта больш пра хакей, які аб'ядноўвае людзей. Мы ўдзельнічаем і атрымліваем асалоду ад гульні. Дасылаем навіны з спаборніцтваў дадому ў Эстонію, людзі бачаць, што тут дружная сям'я, — адзначыў абаронца зборнай Балтыі Юры Рооба. — Нам вельмі падабаецца арганізацыя гэтага турніру. Бываў не раз на розных спаборніцтвах самага высокага ўзроўню і магу сказаць, што ў Мінску ўсё зроблена ані не горш, а шмат у чым нават лепш». Джым Слэйтар, капітан амерыканскай дружыны, якая ўпершыню выступае ў беларускай сталіцы, не хаваў эмоцый: «Калі нам паведамілі, што будзем гуляць супраць Прэзідэнта Беларусі, усе хлопцы сказалі — гэта проста фантастыка. Але адна справа пачуць пра гэта, а зусім іншая — выйсці на адзін лёд з кіраўніком дзяржавы. Уражанні проста казачныя». А Васіль Якубоўскі, нападаючы зборнай Украіны, якая сёлета вярнулася ў турнір, не шкадаваў добрых слоў на адрас арганізатараў: «Па арганізацыі, атмасферы — гэта вялікае свята. Дзякуй вашаму Прэзідэнту, што ён праводзіць такія спаборніцтвы. У Беларусі створаны ўсе ўмовы для развіцця хакея, пачынаючы ад арганізацыі і заканчваючы інфраструктурай. Тое, што зроблена ў вас, вартае самай высокай пахвалы».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## На тое турнір і Калядны...

Чым яшчэ «чапляе» хакеістаў з розных краін свету Калядны турнір, дык гэта нязменным дабрачынным складнікам. Ужо каторы год Прэзідэнцкі спартыўны клуб разам з Федэрацыяй хакея Беларусі ладзіць акцыю «Калядная традыцыя», у межах якой удзельнікі турніру з падарункамі едуць да дзяцей, якім патрэбныя асаблівая ўвага і клопат. Падчас такіх мерапрыемстваў ладзяцца вясёлыя гульні і майстар-класы, дзеці дзеляцца сваімі ўменнямі і талентамі. Сёлета хакеісты наведалі выхаванцаў чатырох дзіцячых дамоў кватэрнага тыпу Фрунзенскага раёна сталіцы. Не абышлося і без патрэбных падарункаў. Каманда Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў прывезла барабанную ўстаноўку, зборная Германіі — электраакустычныя гітары, а каманда Прэзідэнта падарыла дзецям гіраскутары і электрасамакаты.

Да таго ж упершыню ў гісторыі спаборніцтваў выручка ад продажу білетаў на вячэрнія матчы, якія праходзілі на вялікай арэне (на ўсе астатнія матчы ўваход быў бясплатны) будзе накіравана на дабрачыннасць: сродкі пералічаць у Мазырскі дзіцячы дом.

## Рэпетыцыя перад сусветным першынством

Шаснаццаты Калядны турнір адметны яшчэ і тым, што праводзіцца за год да чэмпіянату свету па хакеі, які налета прымуць Беларусь і Латвія. Наша краіна, якая стане гаспадыняй першынства другі раз, хоча зрабіць гэтыя сусветныя спаборніцтвы аднымі з найлепшых у гісторыі. Пра гэта кіраўнік нашай дзяржавы казаў на цырымоніі адкрыцця турніру: «Беларусь мае намер падарыць усім такое ж грандыёзнае спартыўнае свята, якім запомніўся нам чэмпіянат свету ў 2014-м». «Вы можаце не сумнявацца: мы разам з нашымі суседзямі на годным узроўні правядзём гэты чэмпіянат. Гэта будзе адзін з найлепшых чэмпіянатаў свету. Я вам гэта цвёрда абяцаю», — запэўнiў Прэзідэнт і Рэнэ Фазеля.



Фота БелТА.

Сумнявацца ў гэтым не выпадае. Асабліва калі згадаць сапраўднае хакейнае свята ў маі 2014-га або — далёка хадзіць не трэба — любы з шаснаццаці Калядных турніраў.

* * *

Што да саміх спаборніцтваў — учора ўвечары ў барацьбе за галоўны прыз Каляднага турніру сышліся заўзятыя супернікі: зборная Прэзідэнта Беларусі і каманда Расіі. Расіяне ў паўфінале абыгралі фінаў (5:2), а беларусы выйгралі ў зборнай ААЭ з лікам 9:5.

Летась у падобным фінале перамаглі беларусы. Як склалася фінальная гульня сёлета, вы ўжо зараз можаце даведацца на сайце zviazda.by або прачытаць падрабязнасці ў заўтрашнім нумары.

# На спартыўным Алімпе

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2019 года.**

Прэміі ўдастоены галоўны дырэктар галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 5» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Павел Булацкі, спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па скачках на батуце Міністэрства спорту і турызму Уладзіслаў Ганчароў, а таксама старшы трэнер нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па сучасным пяцібор'і Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па водных відах спорту Васіль Гулевіч.

Узнагарода прысуджана ім за актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія спрыяюць фарміраванню гарманічнай асобы.

# З АЛЬТЭРНАТЫЎНЫМ ПОГЛЯДАМ

### Прэзідэнт назначыў новага міністра эканомікі

**Пасада міністра заставалася вакантная каля месяца. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка далажыў Аляксандру Лукашэнку, што на пасаду разглядалася некалькі кандыдатур, дэталёва вывучаліся тры. У выніку прыйшлі да высновы, што найбольш годны кандыдат — Аляксандр Чарвякоў, які дагэтуль займаў пасаду першага намесніка міністра эканомікі.**

«У міністра эканомікі мусіць быць не толькі свежы, але і альтэрнатыўны погляд на многія рэчы... Гэта не проста цэнтральная пасада ва ўрадзе — нам трэба самым сур'ёзным чынам арганізаваць работу Міністэрства эканомікі так, каб быў добры экспертны погляд і добрыя праекты нарматыўных актаў для развіцця нашай эканомікі. Аналіз павінен быць сур'ёзны», — абазначыў сваю пазіцыю Прэзідэнт.

Як паведамілі журналістам новы кіраўнік эканамічнага ведамства, сярод ключавых задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы перад міністэрствам, — узровень кадраў, якасць работы дзяржсектара і эфектыўнасць работы прадпрыемстваў на мікраўзроўні, зніжэнне ўразлівасці эканомікі ад знешніх шокаў.

«У Міністэрства эканомікі і інстытута (Аляксандр Чарвякоў узначальваў Навукова-даследчы эканамічны інстытут Мінэканомікі. — «**Зв**».) заўсёды быў альтэрнатыўны погляд на развіццё эканомікі, таму ў гэтых адносінах мы гатовыя даваць розныя альтэрнатыўныя сцэнарыі развіцця і выказваць тыя прагнозы, якія, можа, камусьці будзе і не зусім зручна слухаць. Але трэба казаць праўду», — выказаў упэўненасць спікер.

Магчымасці для ўстойлівага развіцця эканомікі (асабліва ў сённяшняй нестабільнай сітуацыі ў пастаўках вуглевадародаў) новы міністр бачыць у рэсурсах, якія дагэтуль цалкам не задзейнічаны.

«Прайшла мадэрнізацыя, многія заводы ўжо завяршаюць, таму ў гэтым кірунку мы мусім атрымаць высокую аддачу. Другое: сёння ёсць сектары эканомікі з высокім патэнцыялам: сфера паслуг, IT-сектар, біятэхналогіі, фарміндустрыя. Гэтыя кірункі нам трэба максімальна задзейнічаць. І трэцяе — трэба заўсёды шукаць альтэрнатыўныя крыніцы пастаўкі сыравіны. І вельмі важна, канешне, выкарыстоўваць наш чалавечы патэнцыял. Гэты рэсурс мы таксама не да канца выкарыстоўваем», — мяркуе Аляксандр Чарвякоў.

На яго думку, калі ўсе пералічаныя кірункі рэалізаваць, эканоміка будзе дастаткова ўстойлівая да знешніх шокаў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# МАКЕЙ І ПАМПЕА ПРАВЯЛІ ТЭЛЕФОННУЮ РАЗМОВУ

**Напярэдадні Каляд, 6 студзеня, адбылася тэлефонная размова міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея з дзяржаўным сакратаром ЗША Майклам Пампеа. Пра гэта паведамляе прэс-служба МЗС Беларусі.**

Падчас размовы кіраўнік знешнепалітычнага ведамства ЗША растлумачыў прычыны пераносу тэрміну свайго візіту ў Мінск, які раней быў запланаваны на 4 студзеня. З беларускага боку пацверджана гатоўнасць прыняць дзяржаўнага сакратара ЗША з візітам ва ўзаемапрымальныя даты, адзначана важнасць адкрытага абмену думкамі па пытаннях развіцця двухбаковых адносін, сітуацыі ў рэгіёне і свеце ў цэлым.

У ходзе абмеркавання сітуацыі на Блізкім Усходзе Уладзімір Макей выказаў асуджэнне любых дзеянняў, якія парушаюць прадугледжаныя Венскай канвенцыяй аб дыпламатычных зносінах прывілеі і імунітэты дыпламатычных прадстаўніцтваў. Ён заявіў, што беларускі бок заклікае ўсіх праяўляць стрыманасць і імкнуцца да дээскалацыі напружанасці, а таксама падкрэсліў неабходнасць захавання прынцыпаў міжнароднага права ў мэтах устойлівага забеспячэння міжнароднай бяспекі ў глабальным і рэгіянальным вымярэннях.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Студзень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**Люты**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | |

**Сакавік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**Красавік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

**Май**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

**Чэрвень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |




**Ліпень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**Жнівень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

**Верасень**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

**Кастрычнік**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

**Лістапад**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | | | | | | |

**Снежань**

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Праваслаўны каляндар

**19 красавіка — Светлае Уваскрэсенне Хрыстова. Вялікдзень**

## Двунадзясятыя святы

7 студзеня, аўторак ............Раство Хрыстова
19 студзеня, нядзеля ...........Хрышчэнне Гасподняе
15 лютага, субота ................Стрэчанне Гасподняе
7 красавіка, аўторак ............Добравешчанне Прасвятой Багародзіцы
12 красавіка, нядзеля........... Уваход Гасподні ў Іерусалім. Вербная нядзеля
28 мая, чацвер .....................Узнясенне Гасподняе
7 чэрвеня, нядзеля ..............Дзень Святой Тройцы. Пяцідзясятніца
19 жніўня, серада.................Праабражэнне Гасподняе
28 жніўня, пятніца ...............Успенне Прасвятой Багародзіцы
21 верасня, панядзелак ......Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы
27 верасня, нядзеля ............Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга
4 снежня, пятніца .................Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

## Вялікія святы

14 студзеня, аўторак .............Абрэзанне Гасподняе і памяць свяціцеля Васілія Вялікага
7 ліпеня, аўторак.....................Нараджэнне Іаана Прадцечы
12 ліпеня, нядзеля ..................Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла
11 верасня, пятніца.................Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы
14 кастрычніка, серада ..........Пакроў Прасвятой Багародзіцы

## Саборы Беларускіх святых

28 чэрвеня, нядзеля .................Сабор Беларускіх святых
1 лістапада, нядзеля.................Сабор навамучанікаў і вызнаўцаў зямлі Беларускай

## Шматдзённыя пасты

Вялікі пост ..........................з 2 сакавіка да 18 красавіка
Пятроў пост ........................з 15 чэрвеня да 11 ліпеня
Успенскі пост.......................з 14 жніўня да 27 жніўня
Пост перад Раством Хрыстовым.....з 28 лістапада да 6 студзеня 2021 года

## Аднадзённыя пасты

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду
Навячэр`е Богаяўлення ............................18 студзеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы .....11 верасня
Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга .............27 верасня

## Усёедныя тыдні

(па серадах і пятніцах посту няма)

Калядны перыяд ............. з 7 да 17 студзеня
Мытара і фарысея ........... з 9 да 15 лютага
Сырны (масленічны)........ з 24 лютага да 1 сакавіка
Велікодны (Светлы)......... з 19 да 25 красавіка
Троіцкі .............................. з 7 да 13 чэрвеня

## Дні асаблівага памінання спачылых

Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў за веру Хрыстову ............ 9 лютага
Субота мясапусная.................................. 22 лютага
Субота 2-га тыдня Вялікага посту........... 14 сакавіка
Субота 3-га тыдня Вялікага посту........... 21 сакавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту........... 28 сакавіка
Радаўніца.................................................. 28 красавіка
Памінанне спачылых воінаў..................... 9 мая
Субота Троіцкая ....................................... 6 чэрвеня
Субота Дзімітраўская .............................. 7 лістапада

# Мусульманскія святы

27 лютага..............................Ноч Рагаіб
21 сакавіка ...........................Ноч Мірадж
7 красавіка ...........................Ноч Бараа
24 красавіка .........................Пачатак месяца посту — Рамазан
19 мая ...................................Ноч аль-Кадр
24 мая ...................................Ураза-Байрам
30 ліпеня ..............................Дзень стаяння на гары Арафат
31 ліпеня ..............................Курбан-Байрам
20 жніўня .............................Новы 1442 год па Хіджры
29 жніўня .............................Ашура, дзень памінання пракокаў і пасланнікаў Алаха
28 кастрычніка .....................Ноч нараджэння Прарока Мухамада (Маўлід ан-Набі)

# Каталіцкі каляндар

1 студзеня.....................Святой Багародзіцы Марыі
6 студзеня.....................Аб'яўленне Пана (Тры Каралі)
12 студзеня...................Хрост Пана
2 лютага........................Ахвяраванне Пана
26 лютага .......................Папялец (пачатак Вялікага посту)
1 сакавіка ......................Першая нядзеля Вялікага посту
19 сакавіка ..................Святога Юзафа
25 сакавіка ..................Звеставанне Пана
5 красавіка ..................Пальмовая нядзеля
12 красавіка ................Вялікдзень
19 красавіка ................Божай міласэрнасці
21 мая ..........................Унебаўшэсце Пана
31 мая ..........................Спасланне Духа Святога
4 чэрвеня ......................Езуса Хрыста, Найвышэйшага і Вечнага Святара
11 чэрвеня ....................Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста
19 чэрвеня ....................Найсвяцейшага Сэрца Езуса
24 чэрвеня ....................Нараджэнне святога Яна Хрысціцеля
29 чэрвеня ....................Святых апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня .........................Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай
6 жніўня ........................Перамяненне Пана
15 жніўня ......................Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі
8 верасня .......................Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі
14 верасня ....................Узвышэнне Святога Крыжа
29 верасня ....................Святых Арханёлаў
1 лістапада ...................Усіх Святых
2 лістапада....................Успамін усіх памерлых вернікаў
29 лістапада .................Першая нядзеля Адвэнту
8 снежня ........................Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі
25 снежня ......................Нараджэння Пана
27 снежня ......................Святой Сям'і

# Лютэранскі каляндар

1 студзеня..........Новы год, Абразанне і нарачэнне імя Ісуса
6 студзеня..........Богаяўленне, Эпіфанія
25 студзеня........Дзень абарачэння святога апостала Паўла
2 лютага............Стрэчанне Гасподняе
26 лютага...........Папяльцовая серада, пачатак Пакутнага часу
6 сакавіка ..........Сусветны дзень малітвы
25 сакавіка ........Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы
5 красавіка ........Вербная нядзеля
9 красавіка ........Вялікі чацвер, Дзень усталявання Прычасця
10 красавіка ......Пакутная пятніца
12 красавіка ......Вялікдзень
25 красавіка ......Дзень святога евангеліста Марка
21 мая ...............Узнясенне Гасподняе
31 мая ...............Пяцідзясятніца, свята сашэсця Святога Духа
7 чэрвеня ...........Тройца — свята Святога Трыадзінства
24 чэрвеня .........Свята Нараджэння Іаана Хрысціцеля
25 чэрвеня .........Дзень Аўгсбургскага веравызнання
29 чэрвеня ............Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня .................Дзень наведвання Марыяй Елісаветы
28 жніўня...............Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій
21 верасня ............Дзень апостала і евангеліста Мацвея
29 верасня ............Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў
4 кастрычніка .......Свята падзякі за ўраджай
18 кастрычніка .....Дзень евангеліста Лукі
30 кастрычніка .....Дзень памінання ахвар гвалту, вайны і тэрору
31 кастрычніка .....Дзень Рэфармацыі
11 лістапада .........Дзень святога Марціна
18 лістапада .........Дзень пакаяння і малітвы
22 лістапада .........Дзень памінання спачылых. Нядзеля вечнасці
24 снежня.............Куцця
25 снежня.............Нараджэнне Хрыстова
26 снежня.............Дзень першапакутніка Стэфана
27 снежня.............Дзень апостала і евангеліста Іаана
28 снежня.............Дзень бязвінна забітых немаўлят
31 снежня.............Пярэдадзень Новага года

# Іўдзейскі каляндар

7 студзеня ...............................Пост 10 тэвета
10 лютага ............................... Ту бі-Шват
9 сакавіка ...............................Пост Эстэр
10 сакавіка .............................Пурым
9—16 красавіка ......................Песах 1—2-і дзень
15—16 красавіка ....................Песах 7—8-ы дзень
12 мая .....................................Лаг ба-Омер
29—30 мая ..............................Шавуот
9 ліпеня....................................Пост 17 тамуза
30 ліпеня..................................Пост 9 Ава
5 жніўня .................................. Ту бі-Аў
19—20 верасня.......................Рош а-Шана
28 верасня .............................Ём Кіпур
3—9 кастрычніка ...................Сукот
10—11 кастрычніка ...............Шміні Ацэрэт
11—18 снежня .......................Ханука
25 снежня ...............................Пост 10 тэвета

Усе яўрэйскія святы пачынаюцца напярэдадні ўвечары.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1:

– капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из: капитальное строение, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитальное строение, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1; капитальное строение, инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения), площадью 160,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2; капитальное строение, инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120), площадью 19,6 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1; капитальное строение, инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 7950,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8 % раствора пенообразователя), объемом 250,0 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб. м), объемом 1000 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г; капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97338 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1189,75 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-121799 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 206,65 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, водопроводная сеть от врезки до КНС, здания насосной станции и производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2; капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБлЗ*95, протяженностью 155 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; внутриплощадочная кабельная линия 0,4 кВ марки АВБбШв, протяженностью 70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; пункты и шкафы распределительные – 68 единиц; камера КСО-272 – 5 единиц; трансформаторная подстанция – 3 единицы; панель ЩО-7024; трансформатор масляный – 6 единиц; трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 – 2 единицы; вентилятор центробежный – 7 единиц; камера орошения – 7 единиц; кондиционер – 6 единиц; бункер пылеулавливающий – 8 единиц; дизель-генератор ДГА-3-48; туя – 3 единицы; липа – 4 единицы.

Лот № 1 расположен на земельных участках: кадастровый номер 440100000002000562, площадью 4,8205 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г; кадастровый номер 440100000002006864, площадью 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; кадастровый номер 440100000002006865, площадью 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; кадастровый номер 440100000002006866, площадью 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; кадастровый номер 440100000002006867, площадью 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121

**Начальная цена продажи – 2 041 427,39 руб.** (два миллиона сорок одна тысяча четыреста двадцать семь рублей тридцать девять копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 102 071 руб. (сто две тысячи семьдесят один рубль)

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1 % от конечной цены продажи объекта. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

**Продавец** – РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 23 января 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.**

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.02.2019 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 21 января 2020 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Извещение о проведении 22 января 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники» с инв. № в ЕГРНИ 600/С-162566 общей площадью 9 270,6 кв. м (**назначение:** сооружение специализированное складов, хранилищ; **составные части и принадлежности:** технологическая площадка для хранения и обслуживания спецтехники – литер А, состоящая из подъезда, трех покрытий, трех бортов, технологической площадки, дорожки, ограждения) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,6243 га, кадастровый номер – 623650100001005212 |
| Местонахождение – Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17 |
| **Начальная цена – 1 311 841,00 бел. руб.** с учетом НДС |
| Сумма задатка – 131 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4–253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (покупатель) обязуется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукционных торгов возместить организатору торгов затраты за организацию и проведение аукциона. Информация о сумме затрат за организацию и проведение аукциона, подлежащих возмещению, доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы затрат за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 22 января 2020 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 08.01.2020 по 20.01.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону 8 (017) 388-43-58.

Телефоны для справок: 8 (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); 8 (017) 388-43-58, 8 (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»)

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «ДОРВОДОКАНАЛ» БАРАНОВИЧСКАЯ ДИСТАНЦИЯ ВОДОСНАБЖЕНИЯ И САНИТАРНО-ТЕХНИЧЕСКИХ УСТРОЙСТВ

| Наименование и местоположение объекта | | Общая площадь, кв. м, целевое назначение | Сумма арендной платы (БАВ) |
|---|---|---|---|
| **ЛОТ** – капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47450 (наименование: склад с рампой; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 417,8 кв. м (склад) и 364,0 (рампа), расположенного по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 14А | | Здание склада (417,8 кв. м) хранение, погрузка и выгрузка грузов | 188,01 |
| | | Рампа (364 кв. м) хранение, погрузка и выгрузка грузов | 87,36 |
| **Начальная цена продажи, руб.** | 3 303,11 | **Сумма задатка, руб.** | 330,31 |

**Продавец:** Барановичская дистанция водоснабжения и санитарно-технических устройств, Брестская обл., г. Барановичи, Слонимское шоссе, 1А, УНП 200272492, тел. 80163 492706.

**Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал.

**Реквизиты для перечисления задатка**: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

**Условия**

1. Срок аренды – 5 (пять) лет;
2. С победителем аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней будет заключен договор аренды;
3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка;
4. Возместить Организатору аукциона расходы по их проведению в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона

**Аукцион состоится 22 января 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, и иную информацию можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) – 10 базовых величин

**Последний день приема заявлений – 21 января 2020 г. до 17.00**

Ранее извещение о продаже права заключения договора аренды имущества, принадлежащего РУП «ДОРВОДОКАНАЛ» Барановичская дистанция водоснабжения и санитарно-технических устройств опубликовано в газете «Звязда» от 03.12.2019

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-57182 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе «Неман») общей площадью 566,4 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советска, 6

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 424355700001000539 площадью 0,1997 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе «Неман»), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советска, 6

**Начальная цена продажи – 8570,53 руб.** (восемь тысяч пятьсот семьдесят рублей пятьдесят три копейки) с учетом НДС

Сумма задатка – 857 руб. (восемьсот пятьдесят семь рублей)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 430/С-57062 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы), обшей площадью 769,5 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советска, 25

Лот № 2 расположен на земельном участке кадастровый № 424385990401000744 площадью 0,2684 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений административного назначения), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Советска, 25. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2 площадью 0,0085 га; земли, находящиеся на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема), код 2.4, площадью 0,2684 га

**Начальная цена продажи – 7 193,39 руб.** (семь тысяч сто девяносто три рубля тридцать девять копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 719 руб. (семьсот девятнадцать рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец** – Новогрудский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231400, г. Новогрудок, ул. Гродненская, 103, тел. 8-01597-239-52

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 24 января 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.**

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.06.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 22 января 2020 г. до 15.00**

*Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

## Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», тел. 8 (0232) 21 60 07

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, руб. с НДС | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок токарно-винторезный 16К20 с инв. № 1049, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **3400,00** | **340,00** |
| 2 | Консольно-фрезерный станок 6Р82Ш с инв. № 1581, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **5600,00** | **560,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок и место подачи заявления** | **По 6 февраля 2020 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2–1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **7 февраля 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2–1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 08.01.2020 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

УНП 491323266

Гасцёўня

# Іван АХЛАБЫСЦІН: «Не магу не думаць пра кашалёк — я ж бацька сямейства!»



**Нядаўна на вялікія экраны выйшла камедыя «Халоп». Адну з яркіх роляў у ёй выканаў Іван Ахлабысцін. Па сюжэце малады распешчаны хлопец Грыша (Мілаш Бікавіч) вядзе разгульнае жыццё, настолькі безадказнае, што ледзь не трапляе ў турму. Каб перавыхаваць сына, бацька-алігарх (Аляксандр Самойленка) і яго знаёмы-псіхолаг (Іван Ахлабысцін) адпраўляюцца ў закінутую вёску, дзе спрабуюць узнавіць атмасферу царскай Расіі 1860 года. У выніку падстаўной аварыі туды трапляе і сам Грыша, які становіцца халопам.**

Іван Ахлабысцін быў на здымках у Беларусі, калі мы сустрэліся, каб абмеркаваць фільм. На час здымак акцёр пасяліўся ў загарадным катэджы недалёка ад Мінска.

Мы праходзім у дом, дзе нас звонкім брэхам сустракае ахоўніца пароды шытцу, якую гаспадар называе Глафірай. «Гэта Плюша, — папраўляе мужа Аксана Уладзіміраўна, а ў позірку папрок. — Жывёл нельга называць людскімі імёнамі!» Яна клапатліва налівае нам чай і частуе цукеркамі. Пакуль перакусваем, Ахлабысцін расказвае пра «Халопа»:

— «Халоп» — гэта лёгкае навагодняе кіно. Гэта буф, які не патрабуе праўдападобнасці і наяўнасці сур'ёзных пытанняў. Калі здымаюць, напрыклад, дэтэктыў, фільму нельга дараваць нематываваную лухту. А ў буфе можа адбывацца што заўгодна.

***— У рэжысёра фільма Кліма Шыпенкі не так шмат камедый. Ці лёгка вам было здымацца?***

— У фільме моцная драматургічная аснова. Я, сам пабыўшы сцэнарыстам, у гэтым разбіраюся. Да таго ж над карцінай працаваў чалавек, якога я ведаю па «Інтэрнах». Ён не халтуршчык. Наогул, у кіно нельга напэўна сказаць, добра атрымаецца ці дрэнна, таму што гэта заўсёды містыка. Бывае, здымаешся — выдатны акцёрскі калектыў, добра працуюць цэхі, выдатная абстаноўка. А выходзіць глупства нейкае. А бывае, праз пень-калоду робяць — там недазнялі, там недагучылі — а ў выніку добры фільм атрымліваецца.

***— Як вам працавалася з нашай зямлячкай Сашай Борціч?***

— Вельмі добра! Мне наогул шанцуе. Дзіўна казаць «нашы-вашы», калі такіх адрозненняў на рабоце не існуе. У нас залатое кам'юніці. Здымалі «Інтэрны» — палова грымёрнага цэха беларусы. Апаратарскія групы, візажысты з «Беларусьфільма» часта змяняюцца з расійскімі, даючы адзін аднаму адпачынак. У нас адбываюцца пастаянны абмен, кругаварот і вытворчы булён.

***— «Халоп» для вас быў роляй для кашалька або для душы? І як часта вы згаджаецеся на ролі дзеля грошай?***

— Ласкай Божай у мяне атрымліваецца сумяшчаць. Я не магу не думаць пра кашалёк, таму што я бацька сямейства. Было б дзіўна, калі б я займаўся выключна самавыяўленнем. Але было б яшчэ больш дзіўна, калі б я прасіў толькі грошы, без якой-небудзь спробы самарэалізавацца. Заўсёды імкнуся знайсці здаровы кампраміс. Мабыць, у маёй біяграфіі няма праектаў толькі дзеля грошай. Як і няма праектаў толькі дзеля самавыяўлення, акрамя, хіба што, аднаго з першых — «Нагі».

***— Маглі б вы каго-небудзь са сваіх дзяцей у выхаваўчых мэтах адправіць у вёску XIX стагоддзя?***

— Лягчэй пабіць. Навошта грошы марнаваць? (*Смяецца.* — **Аўт.**) Узяў рэмень шырокі, каб не скалечыць, — і па ляжках. А гэты... цэлую вёску будаваў. У багатых свае дзівацтвы.

Дзіця — яно ж, як звярок, да пэўнага ўзросту. Караць часам трэба. У гэтым няма нічога дрэннага, калі не страчаная логіка пакарання, і яно разумее, за што атрымлівае. Але выхоўваць трэба незлосліва. Хоць у мяне не такія дзеці. Бывае ўсякае, аднак мы ўмеем дамовіцца.

**«Калі мужчына прыходзіць дадому, ён павінен падпарадкоўвацца ўстаноўкам і правілам жанчыны, таму што яна лепш ведае, як усё працуе ўнутры. Мужчына — гаспадар знешняга свету».**

***— У фільме галоўны герой — распешчаны малады чалавек. Што вы думаеце пра сучасную моладзь, якая яна?***

— Добрая. Я мяркую па сваіх дзецях і іх кампаніі, па хлопцах, з якімі працую на пляцоўцы і якіх бачу на вуліцы. У нас моладзь адэкватная. Засталося нешта вельмі добрае, што было яшчэ ў часы СССР, але і з'явіўся пазітыўны еўрапейскі ўплыў, і гэта выдатная сумесь. Яны ў меру інтэлігентныя, таварыскія, адказныя, умеюць расстаўляць прыярытэты. Вядома, ёсць выключэнні з усяго, але, увогуле, яны ўмеюць пераадольваць складанасці і думаць пра наступствы. Задумваюцца аб прафесіі, а цяпер гэта складана. Ім максімальна ўскладнілі магчымасць атрымання вышэйшай адукацыі, ад гэтага тысячы праблем. Пры ўсім гэтым яны не агрэсіўныя. Як і ў кожным пакаленні, ёсць свае недахопы і мінусы. Але мне падабаецца наша моладзь.

***— Нарабіла шуму гісторыя з эратычнымі сцэнамі Крысціны Асмус у фільме «Тэкст». Ці ёсць усё ж мяжа ў кінематографе, якую нельга пераступаць?***

— Вядома, ёсць, я сам бы ў жыцці не дазволіў сваім дзецям здымацца ў такіх сцэнах. Калі б у мяне пыталіся, зразумела. І па задніцы б ім надаваў, калі б даведаўся, што падобнае адбывалася. Я не бачыў фільм! І не буду глядзець. Гэтыя сцэны — памылка. Бязглуздыя апраўданні, што там анучкі празрыстыя накладваюць і нічога не адбываецца, — гэта лухта сабачая.

Але Крысціна мой сябар. А я істота слабая і часта неаб'ектыўная. Я буду абараняць яе, нават калі яна памыляецца. Таму што ведаю яе як наіўнага рамантыка: яна не распусная сама па сабе. Памятаю Крысціну па рабоце ў «Інтэрнах», і мне цяжка ўявіць, што яна стала амаральным чалавекам. Можа, яна ўзмужнела за гэты час, але дакладна засталася прыстойнай і сумленнай. Усе маюць права на памылку.

***— А як вы ставіцеся да фемінізму?***

— Я не разумею, навошта жанчынам змагацца за тое, каб, напрыклад, насіць цяжкія рэчы? Навошта наогул змагацца за нешта, калі мы іх абагаўляем? Жанчына — гаспадыня ўнутранага свету грамадства. Калі мужчына прыходзіць дадому, ён павінен падпарадкоўвацца ўстаноўкам і правілам жанчыны, таму што яна лепш ведае, як усё працуе ўнутры. Мужчына — гаспадар знешняга свету. Калі жанчына выходзіць туды, ёй лепш слухацца мужчыну, каб не патрапіць у пастку або няёмкую сітуацыю.

***— Што галоўнае ў шлюбе?***

— Яго разуменне. Усведамленне, што ёсць істота, якая стала часткай цябе. З цягам часу муж і жонка праходзяць усе стадыі. Ад сексуальнага партнёрства — праз сяброўства, прывыканне, прыціркі — да самага важнага моманту, калі ты ўжо не можаш аддзяліцца ад сваёй жанчыны. Да піку, да несыгранай ноты, калі ў слухачоў ад захаплення займае дух. Шлюб — гэта нота, якую ніхто не пачуў, але яна самая галоўная.

***— Як звычайна сустракаеце святы?***

— У нейкі момант я зразумеў, што мы перасталі атрымліваць задавальненне і захапленне ад свят. Ці то гэта ўзроставае, ці то нешта змянілася ў нас... Але мы не хацелі, каб так працягвалася, чараўніцтва трэба было вярнуць. Таму дамовіліся з нашымі сябрамі-святарамі слухаць на Новы год літургію. Кажуць, як год пачнеш, так і скончыш. А боская літургія — гэта самае важнае і велічнае, самае прыгожае, з чым можна ўсёй сям'ёй увайсці ў новы год. Таму 31 снежня да дзесяці-адзінаццаці мы прыходзім у храм, які наведваем ужо чвэрць стагоддзя. Збіраюцца нашы сябры, іх дзеці. Літургія заканчваецца а палове першай. Потым мы едзем дадому, а там усё як заўсёды: аліўе, фільм Эльдара Разанава, потым паездка да бацькоў...

Калі мы пачалі сустракаць Новы год так, атрымалася вярнуць гэтае захапленне, свята стала не проста пярэстым, але і асэнсаваным. З тых часоў прытрымліваемся гэтай традыцыі, усё праходзіць аднолькава выдатна. Цяпер, праўда, звыклы ход трохі змяняецца: моладзь паволі пачынае зрушваць нас з вялікага пакоя на кухню. Гоняць нас глыбей у логава, у іх свая атмасфера. Але нам гэта вельмі падабаецца.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**

Фестывалім

# «M.@rt.кантакт-2020» абяцае шмат сюрпрызаў

**Сёння, 8 студзеня, стартуе продаж квіткоў на тэатральныя пастаноўкі XV Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму, які пройдзе з 21 да 27 сакавіка ў Магілёве.**

Напераздзе яшчэ амаль тры месяцы, але аматарам тэатральных эксперыментаў прапануюць пасляшацца. Летась білеты на самыя запатрабаваныя пастаноўкі былі раскуплены на працягу ўсяго некалькіх тыдняў. Нават у першы дзень продажу можна застацца без білета, калі спектакль карыстаецца вялікім попытам.

Гэтым разам у афішы вельмі шмат гучных назваў — Тэатр імя Я. Вахтангава з Масквы, «Каляда-тэатр» з Екацярынбурга, Рускі драматычны тэатр імя А. Грыбаедава з Грузіі, Тэатр.doc з Масквы, ТЮГ імя А. Бранцава з Санкт-Пецярбурга, Тэатр беларускай драматургіі з Мінска, Рускі драматычны тэатр Літвы і іншыя — тэатры прыедуць з 11 краін свету. Праграма таксама ўражвае — Чэхаў, Лермантаў, Шэкспір, Дастаеўскі, Мальер, Гогаль... Але, папярэджваюць арганізатары, гэта ў асноўным сучасныя інтэрпрэтацыі.

— Традыцыйны з усяго гэтага будзе хіба што Шэкспір з яго «Зімовай казкай», — удакладняе **дырэктар Магілёўскага драматычнага тэатра Андрэй НОВІКАЎ.** — Усё астатняе — эксперыментальныя пастаноўкі. Праграма цікавая, але складаная для ўспрымання. Вельмі моцная па ўспрыманні і ўзроўні класіка і разам з тым у сучасным прачытанні.

У форуме бяруць удзел 24 тэатры, якія пакажуць 26 спектакляў, некаторыя пастаноўкі пройдуць нават двойчы.

— Мы разумеем, што для таго ж тэатра Вахтангава адной залы будзе мала, — удакладняе Андрэй Новікаў. — І для тэатра з Лесасібірска, які атрымаў за свой спектакль «Мёртвыя душы» чатыры «Залатыя маскі», — таксама. На такія рэчы заўсёды вялікі попыт, таму мы вырашылі іх прадубляваць.

Традыцыйна акрамя спектакляў у рамках форуму пройдуць майстар-класы, абмеркаванні пастановак з удзелам крытыкаў і тэатразнаўцаў, прэс-канферэнцыі, творчыя сустрэчы, выстаўкі. Будуць працаваць майстэрні маладой рэжысуры і маладой драматургіі. На закрыцці фестывалю будзе таксама агучана «Падзея форуму» па версіі тэатральных крытыкаў і моладзі і ўручаны прызы глядацкіх сімпатый. Прыемна, што фестываль застаецца дэмакратычны па цэнах на пастаноўкі і даступны для большасці насельніцтва.

— Мы разумеем, што асноўны наш глядач — гэта не самы багаты чалавек, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Кажуць, што тэатральнае мастацтва элітарнае, яго можа ўспрымаць толькі 5 % грамадства, але наш форум даказвае, што такіх прыхільнікаў нашмат больш. Праграма «M.@rt.кантакта» накіравана на выхаванне асобы, прымушае задумацца, нешта змяніць у сабе, у грамадстве.

Дарэчы, з нагоды 15-годдзя форуму яго рэдакцыя абвясціла конкурс у сацсетках на прызы форуму. Патэнцыйных гледачоў запрашаюць падзяліцца ўражаннямі пра фестываль пад хэштэгамі #моймартконтакт і #мартконтакт2020. Аўтары самых цікавых пастоў атрымаюць падарункі, а пераможца — білеты на спектакль форуму.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЗЯМЛЯ ДЛЯ РАСАДЫ

**Расада таматаў, перцаў, баклажанаў, агуркоў і капусты будзе моцная і здаровая, калі вырошчваць яе ў правільным субстраце.**

У залежнасці ад культуры, якая вырошчваецца, глебавая сумесь для расады можа складацца з розных кампанентаў. Але ў любым выпадку яна павінна адпавядаць агульным патрабаванням:

- глеба для расады павінна быць урадлівая, то-бок у ёй павінны прысутнічаць усе пажыўныя рэчывы, неабходныя расліне для нармальнага росту і развіцця;
- састаў кампанентаў павінен быць збалансаваны — акрамя арганікі, патрэбны макра- і мікраэлементы ў даступнай для раслін форме;
- па структуры глеба павінна быць лёгкая і друзлая, каб карані раслін атрымлівалі дастатковую колькасць паветра;
- яшчэ адзін важны параметр — вільгацяёмістасць: глебавая сумесь для расады павінна добра ўбіраць і ўтрымліваць вільгаць;
- узровень кіслотнасці (Ph) павінен быць у межах 6,5-7,0 (то-бок трэба, каб глеба мела нейтральную рэакцыю);
- у сумесі не павінна быць хваробатворных мікробаў, насення пустазелля, спор грыбоў і падобных рэчаў, здольных загубіць маладыя расліны;
- якасная глеба для расады павінна быць абсалютна чыстая, без прымешак цяжкіх металаў, адходаў шкодных вытворчасцяў і іншых шкодных рэчываў.



### З чаго прыгатаваць?

Добрым лічыцца такі глебагрунт, у якім прысутнічаюць як арганічныя, так і неарганічныя кампаненты.

У якасці арганічных кампанентаў для глебавай сумесі можна выкарыстоўваць:

- дзярновую зямлю (яе нарыхтоўваюць загадзя — улетку наразаюць дзёран квадратамі і ўкладваюць у штабелі);
- зямлю на агародзе (бяруць проста з градак);
- ліставую зямлю (кампост, прыгатаваны выключна з апалага лісця);
- перагной;
- кампост;
- нізавы торф (верхавы торф занадта кіслы і не падыходзіць для расады);
- мох сфагнум;
- луску сланечніка;
- здробненае яечнае шкарлупіне;
- драўняны попел.

Да неарганічных адносяцца:

- рачны пясок;
- перліт (экалагічна чысты матэрыял, які мае нейтральны Ph і не ўтрымлівае цяжкіх металаў);
- вермікуліт (сітаваты, экалагічна чысты матэрыял, змяшчае невялікую колькасць калію, кальцыю і магнію);
- гідрагель (палімер, які мае высокую вільгацяёмістасць);
- керамзіт;
- здробнены пенапласт.

Расадны грунт — гэта сумесь арганічных кампанентаў (торф, агародная зямля, кампост, драўняная кара і г. д.) з прымешкай неарганічных (пясок, перліт, мінеральныя ўгнаенні і іншыя).

Расадны субстрат — гэта ўсё, што можа замяніць глебу (пілавінне, перліт, гідрагель, пясок, мінеральная вата і іншае).

### Чаго ў глебасумесі быць не павінна

Калі хочаце вырасціць якасную расаду, сачыце за тым, каб у глебасумесь не трапілі кампаненты, якія актыўна раскладаюцца, і гліна.

Рэч у тым, што пры даданні ў грунт свежага гною, неперапрэлага лісця або чайнай заваркі можа пачацца працэс іх гніення, пры якім будзе выдзяляцца цяпло і памяншацца колькасць азоту ў субстраце. А для маладых раслін і тое і другое вельмі шкодна.

Калі тэмпература глебы падымецца вышэй за 30 °С, карані расады могуць загінуць.

Таксама ні ў якім разе не дадавайце гліну — з ёй грунт стане шчыльны, цяжкі, будзе горш прапускаць паветра і вільгаць. У такім субстраце далікатныя сеянцы будуць хварэць і ў рэшце рэшт могуць нават загінуць.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.26 | 17.07 | 7.41 |
| Віцебск — | 9.23 | 16.49 | 7.26 |
| Магілёў — | 9.16 | 16.57 | 7.41 |
| Гомель — | 9.05 | 17.01 | 7.56 |
| Гродна — | 9.40 | 17.23 | 7.43 |
| Брэст — | 9.32 | 17.32 | 8.00 |

## Месяц

*Першая квадра 3 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр.* Канстанціна, Яфіма.
*К.* Артура, Мсціслава, Раймунда.



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 8 СТУДЗЕНЯ

**У краіне**

**1870** год — быў падпісаны ўказ Сената Расійскай імперыі аб заснаванні ў Гомелі гарадскога грамадскага банка. З гэтага часу бярэ свой пачатак гісторыя станаўлення і развіцця банкаўскай сістэмы Беларусі.

**1945** год — нарадзіўся Мікалай Мікалаевіч Андросік, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай мікрабіялогіі і эпізаатапогіі, акадэмік Акадэміі аграрных навук Беларусі (1996), доктар ветэрынарных навук (1989), прафесар (1997). У 1970 годзе скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Працаваў у Беларускім НДІ эксперыментальнай ветэрынарыі, у Галоўным упраўленні аграрнай адукацыі Мінсельгасхарча Беларусі. Аўтар навуковых прац па дыягностыцы, спецыфічнай прафілактыцы і мерах барацьбы з інфекцыйнымі хваробамі жывёл.

**1954** год — бортмеханік Цімафей Рамашкін перашкодзіў захопу тэрарыстамі самалёта Лі-2 у Мінску. Самалёт здзяйсняў рэйс Талін — Мінск — Ленінград. Пасля вылету з беларускай сталіцы ў кабіну пілотаў уварваліся ўзброеныя мужчына і жанчына, якія запатрабавалі выключыць рацыю і ўключыць аўтапілот. Затым жанчына перадала супольніку свой пісталет і пачала звязваць лётчыкаў. Цімафей Рамашкін збіў з ног тэрарыстку і кінуўся на захопніка, але той паспеў стрэліць. Бортмеханік прыняў агонь на сябе, пасля чаго калегі змаглі абясшкодзіць злачынцаў. Самалёт вярнуўся на мінскі аэрадром, дзе ўжо дзяжурылі машыны хуткай дапамогі, але выратаваць бортмеханіка не ўдалося. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 сакавіка 1954 года Цімафею Цярэнцьевічу Рамашкіну за мужнасць і самаадданасць, праяўленыя пры затрыманні бандытаў, пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Астатнія члены экіпажа ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У 1964 годзе ў скверы каля аэрапорта Мінск-1 герою ўсталяваны помнік.



**1990** год — у Мінску пачала выходзіць штотыднёвая інфармацыйна-палітычная газета «7 дней».

**У свеце**

**1910** год — нарадзілася Галіна Сяргееўна Уланава, расійская балерына, народная артыстка СССР (1951), двойчы Герой Сацыялістычнай Працы (1974, 1980). Ганаровы член Амерыканскай акадэміі мастацтваў і навук (1960). З 1928 года — салістка Ленінградскага тэатра оперы і балета імя С. М. Кірава, з 1944-га — вядучая салістка Вялікага тэатра ў Маскве, з 1960-га — балетмайстар-рэпетытар у ім. Развівала прынцыпы і традыцыі рускай балетнай школы. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1941, 1946, 1947, 1950), Ленінскай прэміі (1957).

**1935** год — нарадзіўся Элвіс Прэслі, амерыканскі спявак, акцёр, прызнаны кароль рок-н-рола.



**1950** год — нарадзіўся Алег Міхайлавіч Вавілаў, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Дзіўная жанчына», «Другое нараджэнне», «Гонар маю» і іншых.

**1980** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Андрэя Сахарава пазбавілі звання Героя Сацыялістычнай Працы (у яго былі тры зоркі героя) і ўсіх дзяржаўных узнагарод, якія ён меў. 22 студзеня па дарозе на работу вучоны быў затрыманы, а затым разам з жонкай Аленай Бонэр без суда сасланы ў Горкі — горад, у той час закрыты для наведвання замежнымі грамадзянамі. Сам Сахараў звязваў ссылку са сваімі выступленнямі супраць уводу савецкіх войскаў у Афганістан.

## УСМІХНЕМСЯ

**У дзве гадзіны ночы ўва мне прачынаецца філосаф, у тры гадзіны — лятуценнік, а ў сем гадзін — чалавек, які не выспаўся.**

Ён казаў ёй, што кахае яе. Устаўце слова «толькі» ў любое месца гэтага сказа і глядзіце, як яно змяняе сэнс...

**Я вырашыў сёння ўвечары не есці і дазволіць сабе толькі кавалачак сыру. Але з нейкага перапуду пад ім выпадкова апынуўся кілаграм варанай макароны.**

У ласкавай жанчыны няма недахопаў.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 80.

Нумар падпісаны ў 19.30 7 студзеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12